**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А. Г. Бахановіч
______________________________
Рэгістрацыйны № ______________

# ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей:**
**6-05-0314-02 Культуралогія;**
**6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела ўстаноў
адукацыі Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ М. Б. Юркевіч
____________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі Рэспублікі
Беларусь
________________ С. М. Пішчоў
____________________

Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
_______________ Н. У. Карчэўская
_______________

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце дзяржаўнай установы
адукацыі «Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
________________ І. У. Цітовіч
________________

Эксперт-нормакантралёр
________________ _____________
____________________

Мінск 2025

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;
*Л. К. Кухто,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
кафедра маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»;
*Ю. В. Кавалёва,* загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ПРЫКЛАДНАЙ:**
кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 19.02.2025);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 26.02.2025);
навукова-метадычным саветам па культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, сацыяльна-культурным менеджменце і камунікацыях вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 28.02.2025)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя культуры» складзена для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі спецыяльнасцей 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў агульнай вышэйшай адукацыі

*Мэты вучэбнай дысцыпліны* «Гісторыя культуры»*:*

– паглыбленне сістэмы ведаў па гісторыі культуры;

– раскрыццё сутнасці культуры і заканамернасцей яе дынамікі;

– асэнсаванне ўнікальнага вопыту дыялогу культур, што асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі;

– фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, які грунтуецца на разуменні навуковай карціны свету.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– выяўленне ўсеагульных заканамернасцей функцыянавання розных гістарычных тыпаў культуры;

– вызначэнне месца і ролі кожнай культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы развіцця;

– асэнсаванне адметнасцей розных тыпаў культуры, перспектыў духоўнага развіцця чалавецтва;

– вывучэнне гісторыі сусветнай культуры як сістэмы, як цэласнасці;

– паказ значэння міфалогіі, філасофіі, мастацтва, рэлігіі, навукі як унікальных каштоўнасцей чалавецтва.

На лекцыях і семінарскіх занятках звяртаецца ўвага на асэнсаванне важнейшых гістарычных тыпаў культур, вызначэнне іх статусу, паказе іх сэнсавага напаўненне, выяўленне найбольш агульных якасных рыс. Выкарыстанне шэрага прынцыпаў тыпалагізацыі культур на падставе тэорыі гістарычнай эвалюцыі тэхналогій матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці дазволіла аўтарам паказаць уплыў на культуру пануючых у грамадстве спосабу вытворчасці, светапогляду, рэлігіі, прыродна-геаграфічнага фактару.

У рамках вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя культуры» прасочваецца вялікі шлях чалавечай культуры – ад каменнага тапара да камп'ютара, ад наскальных малюнкаў да мноства кірункаў сучаснага мастацтва. Культура паўстае як дынамічная сістэма, якая ніколі не заставалася нерухомай. Яна развівалася і змянялася ў часе і прасторы разам з грамадствам, якое яе стварала.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны

патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя культуры» прадугледжваецца актуалізацыя міжпрадметных сувязей з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Тэорыя культуры», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Беларуская літаратура», «Сусветная літаратура», «Этнакультуралогія», «Філасофія» і некаторымі іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж гуманітарнымі і ўласна культуралагічнымі праблемамі. Пры гэтым гісторыя культуры разглядаецца як індыкатар стану матэрыяльнай і духоўнай культуры.

У адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі ў выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя культуры» студэнт павінен развіць наступныя ўніверсальныя кампетэнцыі:

– Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі.

– Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні.

Студэнты павінны набыць наступныя базавыя прафесійныя кампетэнцыі:

– Аналізаваць гісторыка-культурны працэс, разумець заканамернасці фарміравання культурна-творчых характарыстык асобы, ладу думкі і дзейнасці чалавека, які жыве ў гістарычна канкрэтным грамадстве.

– Аналізаваць этнакультурную спецыфіку традыцыйнай культуры Беларусі, этнічных працэсаў у Беларусі і ў сучасным свеце.

– Ацэньваць сацыяльныя і іншыя наступствы навуковага і тэхналагічнага развіцця, уплыў тэхнагенных і інфармацыйных працэсаў на змены ў сферы творчасці, культуры, камунікацыі і іншых галінах дзейнасці культуролага.

– Прымяняць сучасныя тэхналогіі сацыякультурнай камунікацыі ў прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– асноўныя этапы развіцця культуры ў сувязі з сусветнай гісторыяй чалавецтва;

– суадносіны культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

*умець:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– аналізаваць ва ўзаемасувязі развіццё культуралогіі, рэлігіі, філасофіі, дасягненні навукі і адукацыі;

– засвоіць мабільную дыдактычную мадэль выкладання культуралогіі;

*валодаць:*

– асноўнымі заканамернасцямі культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя культуры» ўсяго прадугледжана 96 гадзін, з іх 54 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 30 гадзін – лекцыі, 24 гадзіны – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі |
| 1. | Уводзіны | 2 | |
| 2. | Культура першабытнага грамадства | 2 | 2 |
| 3. | Культура старажытных усходніх цывілізацый | 2 | 2 |
| 4. | Культура Старажытнага Егіпта | 2 | 2 |
| 5. | Культура Старажытнага Кітая | 2 | 2 |
| 6. | Культура Старажытнай Індыі | 2 | 2 |
| 7. | Культура Старажытнай Грэцыі як пачатак і парадыгма еўрапейскай культуры | 2 | 2 |
| 8. | Культурная спадчына старажытнарымскай цывілізацыі | 2 | 2 |
| 9. | Культура Візантыі і яе ўплыў на культуру ўсходніх славян | 2 | 2 |
| 10. | Сярэдневяковая культура Еўропы | 2 | 2 |
| 11. | Культура эпохі Адраджэння | 2 | 2 |
| 12. | Культура Новага часу | 2 | 2 |
| 13. | Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX – першай чвэрці XXI ст. | 4 | 2 |
| 14. | Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі | 2 | |
| | **Разам…** | **30** | **24** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Тэма 1. Уводзіны*

Культурагенез як від сацыяльнай і гістарычнай дынамікі культуры. Дэтэрмінанты ўтварэння новых культурных форм і іх інтэграцыя ў існуючыя культурныя сістэмы. Працэсы культурагенеза: генезіс культурных форм і норм; фарміраванне сацыяльных, этнічных, палітычных, канфесіянальных культурных сістэм.

Даследаванне праблем гістарычнага паходжання культуры (Л. Морган, Г. Спенсер, Э. Тайлар, Дж. Фрэзер і інш.).

Аснаванні падзелу культур на гістарычныя тыпы: а) духоўна-культурныя рысы; б) прыродна-геаграфічныя ўмовы; в) мастацка-стылявыя прыметы; г) стадыі гістарычнага развіцця; д) гістарычная эвалюцыя тэхналогій матэрыяльнай, сацыяльнай і інтэлектуальнай дзейнасці.

## *Тэма 2. Культура першабытнага грамадства*

Паняцце першабытнай культуры і яе перыядызацыя. Выжыванне ў прыродным асяроддзі – мэта суб’ектаў першабытнай культуры. Кроўнароднасны спосаб сацыяльнай арганізацыі. Татэмізм як адна з найбольш старажытных форм карціны свету. Анімізм, фетышызм як тыпы светаадчування дагістарычнай эпохі. Актыўнае развіццё псіхікі чалавека першабытнага грамадства. Станаўленне мовы, міфапаэтычнага вобразнага мыслення, навыкаў выяўленчай творчасці. Курганна-мегалітычная культура V–I тыс. да н. э. у Еўразіі. Пячорнае і наскальнае выяўленчае мастацтва (Альтаміра, Ляско, Мантэспан, Тасілі, Чатал-Гуюк і інш.). Помнікі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі.

Узнікненне пахавальных абрадаў і культ продкаў. Рытуал і абрад і іх значэнне. Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі. Фарміраванне традыцыі як сродку акумуляцыі і трансмісіі жыццёвага вопыту.

## *Тэма 3. Культура старажытных усходніх цывілізацый*

Старажытныя цывілізацыі як лакальныя міжэтнічныя супольнасці, якія сфарміраваліся на аснове адзінства пражывання ў адным рэгіёне, працяглага і цеснага культурнага ўзаемадзеяння і культурнага абмену паміж імі.

Культурна-гістарычныя арэалы Усходу: Старажытная Месапатамія, Старажытны Егіпет і Старажытны Іран. Характэрныя рысы старажытных цывілізацый: адаптацыя да прыроды, патрыярхальнасць, іерархічнасць,

аўтарытарнасць, статычнасць, інтраверсія, абстрактнасць мыслення. Спецыфіка разумення асобы на Усходзе.

Культура Месапатаміі і перыядызацыя яе культуры. Містыцызм і «Магічная душа» ў культуры Месапатаміі (О. Шпенглер, М. Эліадэ). Культ лёсу. Развіццё рэлігійных уяўленняў. Пантэон багоў.

Шумерская цывілізацыя. Міфалогія шумераў. Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. Архітэктура шумераў (зікураты). Зараджэнне пісьменнай і прававой думкі ў Месапатаміі. Пачатковыя формы адукацыі.

Вавілонскае царства. Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Літаратурныя творы. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва. Вавілонская башня. «Эпас пра Гільгамеша» як літаратурны помнік старажытнасці. Вісячыя сады Семіраміды. «Законы Хамурапі» – старажытны помнік прававой думкі. «Ідэя таліёна».

Асірыя. Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бібліятэка цара Ашурбаніпала. Асірыйскі этнас у гісторыі.

Культура Старажытнага Ірана. Арыяна. Авеста – найбольш старажытная свяшчэнная кніга чалавецтва. Асаблівасці рэлігіі зараастрызму.

Культура Персіі імперскага перыяду. Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца Персіі горад Персепаль.

### *Тэма 4. Культура Старажытнага Егіпта*

Адметныя асаблівасці старажытнаегіпецкай цывілізацыі. Старажытнаегіпецкая культура як вынік адказу на выклік прыродна-кліматычных умоў (А. Дж. Тойнбі). Піраміда як прасімвал егіпецкай культуры. Час як важнейшая катэгорыя свядомасці егіпцян. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Культ памерлых.

Мастацтва эпохі Эхнатона. Асноўныя выяўленчыя каноны. Пахавальня Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Роспісы пахавальняў. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Луксор, Карнак.

*Егіпет эпохі элінізму.* Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская філалагічная школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

Рымскі перыяд у развіцці культуры Егіпта. Развіццё навуковых ведаў (астраномія, матэматыка, медыцына, ваенная справа і інш.).

## *Тэма 5. Культура Старажытнага Кітая*

Перыядызацыя старажытнакітайскай культуры.

*Перыяд архаікі.* Культура першых дзяржаў. Эпоха Чжоў – «сто школ» у філасофіі Кітая.

*Перыяд класікі.* Утварэнне імперыі Цынь. Імперыя Хань – залаты век культуры.

*Эпоха шасці дынастый.* Рост уплыву будызму на развіццё кітайскай культуры.

Традыцыяналізм кітайскай культуры. Канцэпцыя сярэдзіннай дзяржавы. Культ імператара і продкаў. Сямейна-этнічныя адносіны.

Міфалогія Старажытнага Кітая.

Асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні Старажытнага Кітая: будызм, даасізм, канфуцыянства, маізм. Паняцці «даа», «інь» і «ян» як аснова гармоніі свету. Даоскія тэхнікі самаўдасканалення. Канфуцыянская мараль і мадэль ідэальнага чалавека. Прынцып гармоніі ў канфуцыянстве. Будыйская маральная традыцыя.

Рацыянальнасць мыслення як адметнасць кітайскага менталітэту. Навуковыя дасягненні. Стварэнне іерагліфічнай пісьменнасці. Кітайскі каляндар. Дасягненні кітайскай медыцыны. Тэорыя пяці элементаў і пяці колераў і яе ўплыў на мастацтва Старажытнага Кітая (літаратура, выяўленчае мастацтва, дойлідства, музыка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Звычаі і абрады. Сістэма адукацыі і выхавання.

## *Тэма 6. Культура Старажытнай Індыі*

Гістарычныя тыпы індаарыйскай культуры: протаіндыйская культура, індаарыйская культура, культура дынастыі Маўр'яў.

Варна-каставая сістэма: брахманы, кшатрыі, вайш'я, шудры.

Развіццё міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх уяўленняў аб свеце. Ёга як філасофія і практыка. Вучэнне аб душы, карме і сансары. Брахмаізм, будызм, індуізм – асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні. Аморфнасць індуізму. Рэлігійны плюралізм. Важнейшыя прынцыпы будызму. Паняцце нірваны. Махаяна і Хінаяна.

Мастацкая культура Старажытнай Індыі. Веды – рэлігійна-філасофскі помнік. «Махабхарата» і «Рамаяна» – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння. Значэнне танца ў індыйскай культуры. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы. Прававая культура (Закон Ману). Развіццё навукі і тэхнікі (астраномія, матэматыка, медыцына і інш.). «Камасутра» – энцыклапедыя сямейных адносін.

## *Тэма 7. Культура Старажытнай Грэцыі як пачатак і парадыгма еўрапейскай культуры*

Паняцце «антычнасць». Антычны тып культуры, яго адметнасці: антрапацэнтрызм, аганальнасць, антрапаморфнасць, дэмакратычнасць, касмалагізм, суразмернасць, політэізм, міфалагічнасць і інш. Полісная аснова антычнай культуры. Асновы грэка-рымскай цывілізацыі (М. Я. Данілеўскі, О. Шпенглер, К. Ясперс).

Перыядызацыя старажытнагрэчаскай культуры.

*Крыта-мікенскі перыяд.* Рассяленне старажытных этнасаў у III–II тыс. да н. э. па Еўропе і Міжземнамор'і. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Мінойская культура вострава Крыт. Сімволіка Лабірынта. Кноскі палац. Абшчынна-радавая культурная спадчына ў культуры Грэцыі. Уяўленні аб культурнай дынаміцы.

Грэцыя перыяду архаікі. Адраджэнне Грэцыі пасля «цёмных стагоддзяў». Алімпійскія гульні. Міфалогія антычнай Грэцыі: пантэон, асноўныя цыклы міфаў. Апалонаўскае і дыянісійскае ў культуры. Элінскі эпас. Грэчаская лірыка. Натурфілосафы эпохі архаікі. Праблема спалучэння рацыянальнасці і містыкі. Грэчаскі архітэктурны ордэр. Ідэя «парадку» і прынцып «меры». Скульптура. Дэкаратыўнае мастацтва.

Старажытная Грэцыя перыяду класікі. Палітычная культура старажытных грэкаў. Класічны перыяд у гісторыі філасофіі (Сакрат, Платон, Арыстоцель). Афіны – цэнтр адукацыі і культуры. Акадэмія Платона і ліцэй Арыстоцеля. Антычныя каляндарныя містэрыі і мастацтва драмы. Афінскі Акропаль – шэдэўр антычнай архітэктуры. Алімпія. Скульптары эпохі класікі. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

Культура элінізму. Сінтэз мастацтва Захаду і Усходу. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. Асноўныя дасягненні эпохі. Цуды свету. Скульптура. Мастацтва як адлюстраванне змен у светаўспрыманні грэкаў. Карынфскі ордэр як сімвал эклектызму.

## *Тэма 8. Культурная спадчына старажытнарымскай цывілізацыі*

Перыядызацыя старажытнарымскай культуры: этрускі і царскі перыяды; перыяд рэспублікі; перыяд імперыі. Уплыў грэчаскай культуры на рымскую цывілізацыю. «Civitas» як падмурак рымскай культуры. Своеасаблівасць карціны свету ў Старажытным Рыме. Каштоўнасці рымскай супольнасці. Канцэпт лёсу (фатуму) у сістэме каштоўнасцей рымлян.

Міфалагізацыя гісторыі як характэрная рыса рымлян. Пантэон Рыма (Марс, Юнона, Юпітэр і інш.). Крызіс старажытнарымскай рэлігіі. Хрысціянства як сінтэз іўдзейскай і антычнай культурных традыцый.

Палітычная і прававая культура Рыма (Г. Ю. Цэзар, М. Т. Цыцэрон, Палібій і інш.). Рымская філасофская школа (Марк Аўрэлій, Луцый Сенека і інш.). Стаіцызм. Рыторыка як адлюстраванне ментальнай асновы рымскай культуры. Тэатр і святы. Рымскі раман. Скульптурны партрэт. Уплыў культуры Рыма на станаўленне заходняй цывілізацыі. Навука і адукацыя. Рымскія гісторыкі. Асноўныя архітэктурныя формы, тыпы будынкаў. Рымскае дойлідства. Мастацкая спадчына Геркуланума. Інтымізацыя культуры (Катул, Авідзій, неатэрыкі). Раннехрысціянскае мастацтва і сімволіка.

### *Тэма 9. Культура Візантыі і яе ўплыў на культуру ўсходніх славян*

Хрысціянскі характар візантыйскай цывілізацыі. Станаўленне сярэдневяковага грамадства. З’яўленне і развіццё феадалізму. Культ імператарскай улады. Візантыйская культура – наследніца антычнай культуры. Сінтэз грэка-рымскай і ўсходняй культур. Прынцып «адна дзяржава – адна рэлігія». Хрысціянства як дзяржаўная рэлігія. Фарміраванне хрысціянскай царквы як асобай арганізацыі. Барацьба «іканаборцаў» і «іконапаклоннікаў». Ератычныя рухі: арыянства, монафізіцтва і інш.

Філасофска-тэалагічная думка ў Візантыі. Неаплатанізм (Прокл, Псеўда-Дыянісій Арэпагіт, Юліян Адступнік). Багаслоўскія ідэі Іаана Дамаскіна і Максіма Спаведніка. Містычная багаслоўская тэорыя Сімяона Багаслова. Уздым рацыяналістычнай думкі (Фоцій). Паварот да платанізму і неаплатанізму (Міхаіл Псел).

Мастацтва Візантыі. Культавая і свецкая музыка. Храм як сімвал свету. Сабор Святой Сафіі – галоўны храм Візантыі. Выяўленчае мастацтва: фрэскі, мазаікі, іконы. Літаратура (агіяграфія, духоўныя гімны). Літургічная драма (містэрыя). Адукацыя. Візантыйскі энцыклапедызм. Уплыў культуры Візантыі на славянскі свет. Культурныя стасункі Візантыі, Полацкага і Тураўскага княстваў. Хрышчэнне беларускіх зямель.

### *Тэма 10. Сярэдневяковая культура Еўропы*

Паняцце «сярэдневякоўе» і яго інтэрпрэтацыя ў еўрапейскай гуманітарнай думцы (Ф. Ніцшэ, Ё. Хёйзінга, М. Блок, Ф. Бродэль, Ж. Ле Гоф і інш.). Перыядызацыя еўрапейскай сярэдневяковай культуры: ранняя, сталая, позняя. Хрысціянства як каштоўнасна-сімвалічная аснова культуры

Сярэдневякоўя. Узнікненне хрысціянскай ідэалогіі і яе роля ў станаўленні хрысціянскага тыпу культуры (Іаан Златавуст, св. Аўгусцін, Фама Аквінскі і інш.).

Адметнасць сярэдневяковай карціны свету. Храм як «вертыкаль духу»; горад як «гарызанталь гісторыі». Ідэя ўсеагульнай любові. Боскае адкрыццё як аснова пазнання свету. Ідэя асабістага выратавання веруючага. Хрысціянская сатэрыялогія – вучэнне аб выратаванні. Дуалізм сярэдневяковай свядомасці: горні свет і дольны свет.

Субкультуры Сярэдневякоўя: хрысціянская, рыцарская, бюргерская, вясковая, варварская. Узаемасувязь рэлігійнай, арыстакратычнай і народнай культуры.

Мастацкая сярэдневяковая культура. Раманскі і гатычны стылі і іх адметныя рысы. Хрысціянскі канон. Хрысціянская іканаграфія. Мазаікі і фрэскі. Кніжная мініяцюра. Помнікі архітэктуры: саборны ансамбль у Пізе, царква Нотр-Дам дзю Пор у Клермон-Феране, сабор Парыжскай Божай Маці і інш. Музычнае мастацтва: грыгарыянскі харал, паліфанія, чатырохлінейны нотны стан. Літаратура: эпас, літургічная драма, раман, куртуазная паэзія. Сярэдневяковы тэатр: містэрыя, фарс, міракль. Народная карнавальная культура як «іншае жыццё народа на аснове смеху». Станаўленне адукацыі. Узнікненне першых універсітэтаў.

Сярэдневяковая беларуская культура. Хрысціянскі гуманізм беларускіх асветнікаў: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Школы дойлідства на беларускіх землях. Помнікі архітэктуры: Сафійскі сабор у Полацку, гродзенская царква Барыса і Глеба, царква Благавешчання ў Віцебску і інш. Манументальны і станковы жывапіс. Дробная пластыка. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сістэма адукацыі і выхавання. Царкоўныя і манастырскія школы.

### *Тэма 11. Культура эпохі Адраджэння*

Агульная характарыстыка эпохі Адраджэння. Сацыяльна-эканамічныя передумовы ўзнікнення культуры Рэнесансу. Тыпы рэнесансных культур: італьянскае Адраджэнне, Паўночнае Адраджэнне, Няпоўнае Адраджэнне (Англія, Партугалія, Чэхія, Польшча). Протарэнесанс, Ранні Рэнесанс, Высокі Рэнесанс, Позні Рэнесанс. Змяненне тэацэнтрычнага светапогляду на гомацэнтрычны. Новая інтэрпрэтацыя традыцыйных хрысціянскіх догматаў. Засваенне антычнай культурнай спадчыны. Ідэалы і каштоўнасці рэнесансных гуманістаў. Ідэал гармоніі чалавека і космасу.

Мастацтва як увасабленне новай карціны свету. Італьянскія жывапісныя школы. Творчасць Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Тыцыяна, Батычэлі,

Рафаэля, Альбрэхта Дзюрэра, Іераніма Босха і інш. Ман'ерызм як стыль Рэнесансу. Адлюстраванне ў тэатральным мастацтве гуманістычных ідэй і супярэчнасцей эпохі (У. Шэкспір). Адраджэнне камедый, трагедый, пастаралі. La commedia erudite і камедыя дэль артэ.

Музычнае мастацтва: ars antigua, ars nova. Нідэрландская поліфанічная школа. Развіццё народнай песеннай творчасці і інструментальная музыка. Фларэнтыйская камерата.

Асаблівасці літаратуры Рэнесансу. «Кніга песень» Ф. Петраркі. Рэнесансная навела Д. Бакачыа, Л. Арыоста. Рэалістычна-фантастычныя раманы Ф. Рабле, М. Сервантэса.

Асноўныя дасягненні ў галіне навукі і іх уплыў на духоўную культуру. Светапоглядныя канцэпцыі С. Буднага, В. Цяпінскага, А. Волана і інш. Культуратворчая дзейнасць Ф. Скарыны. Станаўленне і развіццё беларускай мовы, пісьменнасці і літаратуры (М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі).

Пашырэнне адукацыі. Брацкія школы. Езуіцкія калегіумы. «Граматыка» М. Сматрыцкага.

### *Тэма 12. Культура Новага часу*

Агульная характарыстыка культуры Новага часу. Сацыяльна-палітычныя дэтэрмінанты фарміравання культуры Новага часу.

Пераходны характар культуры Новага часу. Класіцызм. Барока як стыль эпохі. Навуковая рэвалюцыя. Культ навукі і тэхнікі. Секулярызацыя культуры і быту. Асвета як ідэалогія буржуазіі. Пратэстантызм і яго роля ў фарміраванні капіталістычных адносін (М. Вебер).

Агульная характарыстыка культуры Новага часу. Філасофска-рэлігійныя канцэпцыі Новага часу. Асветніцкія ідэі Д. Дзідро, Вальтэра, Ж.-Ж. Русо і інш.

Асноўныя мастацкія напрамкі. Культура ракако. Мастацтва Францыі, Англіі, Іспаніі, Германіі. Венская школа ў музыцы. Фламандская школа жывапісу.

Культура Захаду ў XIX ст.: агульная характарыстыка эпохі. Эпоха рамантызму. Ідэалы і сімвалы рамантызму ў мастацтве. Стагоддзе літаратуры, музыкі, тэатра. Стыль ампір. Новыя напрамкі ў архітэктуры. Містычны элемент рамантызму (У. Блэйк). Эскапісцкія ідэі рамантызму (Дж. Г. Байран і інш.). Цікавасць да культур Усходу і народнай культуры.

Пошукі рэалістычнага мастацтва. Эстэтычныя ідэалы рэалізму. Адлюстраванне рэалій буржуазнай культуры. Імпрэсіянізм у культуры Еўропы.

Дэкаданс. Культурфіласофская рэфлексія Ф. Ніцшэ. Стыль мадэрн. Мадэрнізм – інавацыйна-крэатыўны тып культурнага светабачання. Авангардныя напрамкі ў культуры як адлюстраванне супярэчнасцей быцця Еўропы (кубізм, сімвалізм, сюррэалізм, футурызм, экспрэсіянізм і інш.).

Беларуская культура XVII–XVIII стст. Грэка-каталіцкая царква і яе ўплыў на развіццё культуры. Асвета і адукацыя. Асветніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага, М. Пачобута-Адляніцкага, Л. Залускага, Я. Даманеўскага, Б. Дабашэвіча і інш.

Фарміраванне дэмакратычнай ідэалогіі і грамадскай думкі ў XIX ст. (К. Каліноўскі, А. Незабытоўскі, Ф. Савіч і інш.).

Мастацкая культура ў Беларусі. Віленскае барока, тэатр, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Вобраз рамантычнага героя ў творчасці А. Міцкевіча. Эстэтыка рамантызму ў паэзіі Т. Зана і Я. Чачота. Тэндэнцыя ўпарадкавання існуючага ў драматургіі В. Дуніна-Марцінкевіча. Прынцыпы рэалізму і народнасці ў творах Ф. Багушэвіча. Рамантычныя і рэалістычныя пачаткі ў паэзіі Я. Лучыны.

### *Тэма 13. Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX – першай чвэрці XXI ст.*

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе наступствы. Крызіс каштоўнасцей розуму, прагрэсу і самабытнасці свету ў познім індустрыяльным грамадстве. Культура мадэрну як пошук новых духоўных асноў быцця. Сацыяльна-палітычныя рухі левaрадыкальнага і праварадыкальнага зместу.

Масавае грамадства і культура. Тэхналагічныя і сацыяльныя дэтэрмінанты фарміравання масавай культуры. Механізм масавай культуры і яе функцый.

Масмедыя і масавая культура як фактар фарміравання ідэнтычнасці homo digital.

Ідэйна-мастацкія плыні і іх уплыў на формы і змест сучаснай мастацкай культуры.

Феномен постмадэрнізму і яго адметныя ўласцівасці. Рост культурнай разнастайнасці. Узаемадзеянне культур, міжкультурная камунікацыя. Дыялог культур. Варыянты ўзаемадзеяння самабытнасці і сучаснасці.

Агульныя прынцыпы і каштоўнасці савецкай культуры. Уніфікацыя культурнага жыцця ў савецкім грамадстве. Дэструкцыя сацыякультурнай сферы. Фарміраванне постсавецкага грамадства і яго культуры.

Перадумовы фарміравання сусветнай культуры. Складванне планетарнай прасторы культуры. Праблема глабальных цэнтраў і перыферыі культуры. Полімарфізм культуры як фактар устойлівага развіцця сучаснага грамадства.

Футуралогія аб глабальным мадэляванні розных аспектаў сусветнай культуры.

### *Тэма 14. Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі*

Адметнасці сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі на мяжы XX–XXI стст. Беларуская культура ў кантэксце сусветнага культурнага працэсу. Глабалізацыя як фактар сацыядынамікі культуры. Развіццё match рознабаковых міжнародных культурных кантактаў.

Творчыя пошукі і эксперыменты суб’ектаў сучаснай беларускай мастацкай культуры.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Махлина, С. Т.* Семиотика культуры повседневности : учебник для вузов / С. Т. Махлина. – 2-е изд., доп. – М. : Юрайт, 2020. – 255 с. – С. 39–47, 94–112, 114–250.

2. *Семилет, Т. А.* Исследования культуры в современном мире : учеб. пособие для бакалавриата и магистратуры / Т. А. Семилет. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2019. – 137 с. – С. 32–44,76–95, 97–134.

3. *Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ па культуралагічных і мастацтвазнаўчых спецыяльнасцях / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала. – Мінск : [б. в.], 2009. – 310 с. – С. 6–30, 93–106, 218–263.

4. *Смолік, А. І.* Культуралогія : вучэб.-метад. комплекс па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-21 04 01 «Культуралогія», спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 «Тэорыя і гісторыя культуры». Раздзел 1. Тэорыя культуры / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, С. Л. Шпарло. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 342 с. – С. 115–231, 293–340.

*Дадатковая*

1. *Борзова, Е. П.* Сравнительная культурология : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Е. П. Борзова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 554 с.

2. *Горелов, А. А.* История мировой культуры : учеб. пособие / А. А. Горелов. – 5-е изд., стер. – М. : Флинта, 2016. – 508 с.

3. История и теория культуры : учеб. пособие для академического бакалавриата / В. П. Большаков, К. Ф. Завершинский, Л. Ф. Новицкая ; под общ. ред. В. П. Большакова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2018. – 289 с.

4. Культурология. История мировой культуры: хрестоматия : учеб. пособие / А. Н. Маркова [и др.]. – 2-е изд., стер. – М. : Юнити, 2015. – 607 с.

5. *Маркова, А. Н.* Культурология. История мировой культуры : учеб. пособие / А. Н. Маркова. – М. : Волтерс Клувер, 2009. – 496 с.

6. *Никитина, И. П.* Философия искусства : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным наукам : в 2 ч. – Ч. 2 / И. П. Никитина. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 229 с.

*7. Никитина, И. П.* Философия искусства : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям : в 2 ч. – Ч. 1 / И. П. Никитина. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 211 с.

*8. Парашкоў, С. А.* Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў ; Магілёўск. дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 442 с.

*9. Скараходаў, У. П.* Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У. П. Скараходаў. – Мінск : БелДІПК, 2003. – 341 с.

*10. Сокольникова, Н. М.* История стилей в искусстве : учебник и практикум для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Н. М. Сокольникова. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 404 с.

*11. Смолік, А. І.* Культура Беларусі XI–XIX стст. Навуковы даведнік / А. І. Смолік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1998. – 182 с.

*12. Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М. : Прогресс, 1991. – 640 с.

*13. Тоффлер,* Э. Третья волна / Э. Тоффлер. – М. : АСТ, 2002. – 776 с.

*14. Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М. : АСТ, 2004. – 220 с.

*15. Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Минск : Коллегиум, 1997. – 253 с.

*16. Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2003. – 603 с.

*17. Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья / Й. Хёйзинга. – М. : Наука, 1988. – 544 с.

*18.* Хрестоматия по истории мировой культуры / под ред. Г. В. Гриненко. – 3-е изд., перераб. и доп. − М. : Высш. образование, 2005. − 940 с.

*19. Швед, І. А.* Беларуская міфалогія : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях «Руская філалогія (па напрамках)», «Беларуская філалогія (па напрамках)» : у 2 ч. – Ч. 1. Касмалогія / І. А. Швед. – Мінск : РІВШ, 2022. – 259 с.

*20. Швед, І. А.* Беларуская міфалогія : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях «Руская філалогія (па напрамках)», «Беларуская філалогія (па напрамках)» : у 2 ч. – Ч. 2. Антрапалогія. Дэманалогія / І. А. Швед. – Мінск : РІВШ, 2022. – 287 с.

*21. Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М. : Политиздат, 1991. – 528 с.

## Метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; праектныя тэхналогіі; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады); метад аналізу канкрэтных сітуацый; гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

У якасці элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнта магчыма выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый: падрыхтоўка і абарона тэматычных паведамленняў, рэфератаў, эсэ, мультымедыйных прэзентацый, пры ацэньванні якіх звяртаецца ўвага на змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладання матэрыялу, крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення і г. д.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе абумоўлена неабходнасцю павышэння якасці адукацыі для будучага спецыяліста сацыякультурнай сферы, якаснага размеркавання часу на засваенне матэрыялу падчас лекцыйных, семінарскіх, практычных заняткаў, патрабаваннямі да адаптацыі да сусветнай адукацыйнай прасторы. Вышэйадзначанае фарміруе статус самастойнай работы студэнтаў як абавязковага базавага элемента прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

З мэтай павышэння эфектыўнасці неабходна прытрымлівацца наступных рэкамендацый:

– абазначыць перад пачаткам семестра найбольш ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесіянальнай і асобаснай кампетэнтнасці спецыяліста;

– на належным метадычным узроўні арганізаваць самастойную работу;

– ажыццяўляць перыядычны кантроль за СРС і кіраўніцтва ёю;

– стварыць спрыяльныя ўмовы для яе ажыццяўлення;

– рэкамендаваць неабходную вучэбную, навуковую літаратуру, перыядычныя выданні культуралагічнага профілю;

– праводзіць пры неабходнасці кансультаванне і карэкцыю памылак студэнтаў, якія дапускаюцца ў працэсе самастойнага вывучэння вызначаных тэм;

– падвесці вынікі самастойнага засваення студэнтамі пытанняў вызначаных тэм, выкарыстоўваючы розныя формы кантролю (тэсты, эсэ, калёквіумы, рэфераты і даклады).

## Прыкладны пералік заданняў для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прымяняюцца наступныя формы кіруемай самастойнай работы:

– кантралюемая самастойная работа ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў, уключаючы пісьмовыя апытанні з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка і прадстаўленне мультымедыйных прэзентацый на семінарскіх занятках;

– дыскусіі па тэмах: «Культура першабытнага грамадства», «Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX – першай чвэрці XXI ст.».

Выкананая праца павінна адлюстроўваць ступень засваення тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна думаць, лагічна разважаць, ставіць пытанні, абагульняць, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**
**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей: 6-05-0314-02 Культуралогія;**
**6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі**

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2025. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Лічбавы друк.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.